шукаў гэтыя крыніцы якраз у беларускай народнай песні... і кожнаму, безумоўна, ясна, што без беларускай народнай песні, без народнай паэзіі беларусаў не было б многіх балад А. Міцкевіча, а калі б яны і з'явіліся, то мелі б іншы характар». Такой думкі прытрымліваецца і беларускі літаратуразнаўца, паэт Алег Лойка, адзначаючы, што «сувязь Адама Міцкевіча з вуснай паэтычнай творчасцю народа была адным з рашаючых фактараў, якія вызначылі моц Міцкевіча – мысліцеля і арыгінальнага мастака слова».

Большасць баладаў А. Міцкевіча з'яўляецца вынікам творчага пераасэнсавання беларускіх фальклорных матэрыялаў, паэтычнай апрацоўкай народных вераванняў, уяўленняў, паданняў Наваградчыны, тых мясцінаў, дзе прайшлі дзіцячыя гады паэта.

«Свіцязянка» – адна з трох балад Адама Міцкевіча, прысвечаных аўтарам возеру Свіцязь, што на Наваградчыне. Пераапрацаваўшы шматлікія павер'і і паданні, Міцкевіч стварыў глыбока патрыятычны твор, у якім раскрываецца любоў да свайго роднага краю, самаадданая барацьба супраць ворага, бессмяротнасць подзвігу ў імя жыцця сваёй Бацькаўшчыны. Пісьменнік паказаў, што сіла народа неўміручая, ворагу няма месца на захопленай зямлі. Балада «Свіцязянка» закранае не менш важную праблему ў жыцці чалавека – вернасць. Той, хто адданы свайму каханню, адданы і сваёй радзіме. Менавіта на матыве віны і пакарання пабудаваны дадзены твор А. Міцкевіча.

Творчасць Міцкевіча аказала значны ўплыў на беларускую культуру: на грамадскую свядомасць, літаратуру і мастацтва. На працягу двух стагоддзяў яна была пастаянным элементам літаратурнай адукацыі і патрыятычнага выхавання. Яго паэзія аказала ўплыў на мову і свядомасць, адбілася нават у гутарковай мове. Літаратура XIX і XX стст. поўная метафарамі, цытатамі і алюзіямі на творы Міцкевіча. Творчасць Міцкевіча з'яўлялася крыніцай натхнення і таксама для жывапісцаў, графікаў, кампазітараў. Сам Міцкевіч як сімвал паэта-прарока стаў тэмай шматлікіх партрэтаў, малюнкаў, медальёнаў і скульптур.

УДК 947.6

## ВІЦЕБСК – ГОРАД МАІХ ПРОДКАЎ, МОЙ ГОРАД

*Студэнты – Чабан М.А., 6 ап, 1 курс, ІТФ;*
*Дамаскевіч А.Ю., 3 мот, 1 курс, ФТС*
*Навуковы кіраўнік – Фокіна І.С., ст. выкладчык*
*УА «Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт»,*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

**Анатацыя.** Цікавасць да сваёй малой радзімы, да свайго горада – аснова глыбокай любові да Радзімы ў цэлым. Ведаць, паважаць і шанаваць сваю гісторыю – гэта значыць, захаваць яе для наступных пакаленняў.

**Ключавыя словы:** гісторыя і сучаснасць, Віцебск, Магдэбурскае права, ратуша.

Як і большасць беларускіх гарадоў, Віцебск быў пабудаваны на месцы зліцця дзвюх рэк – Заходняй Дзвіны і Віцьбы. Ад імя апошняй горад і атрымаў сваю назву. Афіцыйнай датай заснаваня беларускай паўночнай сталіцы лічыцца 974 год. Паводле легенды, вялікая княгіня Вольга ехала берагам Заходняй Дзвіны і ўсталёўвала месца цвінтароў, дзе збіралі даніну. Прыгажосць тутэйшага краявіду так уразіла княгіню, што яна ўсклікнула: «Хай будзе тут горад Віцебск!»

Праўда, у гэтай выдатнай легендзе ёсць адзін нюанс – княгіня Вольга памерла ў 969 годзе, такім чынам, дата 974 год – няправільная. Існуе здагадка, што горад быў заснаваны ў 947 годзе, але пры перапісе Віцебскага летапісу перапісчык пераблытаў лічбы.

Упершыню Віцебск узгадваецца ў «Аповесці мінулых гадоў» у 1021 годзе. Праўда, па дадзеных археалагічных даследаванняў можна зрабіць выснову, што першыя паселішчы тут узніклі задоўга да княгіні Вольгі. Навукоўцы сцвярджаюць, што ў вусце Віцьбы жылі балтыйскія плямёны, а ў IX стагоддзі сюды прыйшлі славянскія плямёны крывічоў.

Размяшчэнне горада было на рэдкасць удалым - ён стаяў на скрыжаванні важнейшых гандлёвых шляхоў. Адзін называўся «з варяг у грэкі», а другі – Волжскім (Булгарскім). Гэта спрыяла эканамічнаму ўздыму Віцебска, які стаў цэнтрам ўдзельнага княства, падпарадкаванага Полацкім князям. Тут бурнымі тэмпамі развіваўся гандаль і рамёствы. Паказальна, што ўжо ў XII стагоддзі тут ўзвялі першы каменны храм – праваслаўную Свята-Дабравешчанскую царкву. Там перапісываліся кнігі і летапісы, навучаліся дзеці, захоўваліся эталоны мер вагі і даўжыні, якія выкарыстоўваліся пры гандлёвых аперацыях.

Гісторыя самастойнага ўдзельнага княства скончылася ў 1318 годзе, калі дачка апошняга князя Яраслава Васільевіча Марыя выйшла замуж за князя Альгерда, сына вялікага князя літоўскага Гедыміна. Віцебскае княства стала часткай ВКЛ.

З 1506 года Віцебск становіцца цэнтрам Віцебскага ваяводства ВКЛ, а з 1569 года – Рэчы Паспалітай. У канцы XVI стагоддзя адбываецца яшчэ адна вельмі важная для горада падзея – ён атрымлівае Магдэбурскае права. У Віцебску ўзводзіцца драўляная ратуша – сімвал самакіравання. Праўда, у 1623 году горад пазбаўляюць права на самакіраванне з-за паўстання гараджан, а ратушу руйнуюць. Але ў 1644 году Віцебск зноў атрымлівае Магдэбурскае права.

У 1792 годзе Віцебск уваходзіць у склад Расійскай імперыі і становіцца цэнтрам Беларускай, а з 1802 года – Віцебскай губерні. З другой паловы XIX стагоддзя пачынаецца росквіт горада. Тут адкрываюцца навучальныя ўстановы, бібліятэкі, прамысловыя прадпрыемствы. У 1866 годзе ў горадзе адкрыта чыгунка. У 1895 году жыхары Віцебска маглі пахваліцца 2 тэатрамі,

8 кнігарнямі, 4 бібліятэкамі. Акрамя таго тут было 3 друкарні і каля 80 прамысловых прадпрыемстваў.

Ліпень 1895 года запомніўся гораду тым, што первая жанчына-парашюцістка В.М. Драўніцкая выканала свой першы скачок. Яшчэ праз тры гады адбылася не менш важная падзея – па горадзе сталі ездзіць трамваі. Гэта былі першыя трамваі ў Беларусі. А ў 1905 годзе для гараджан адкрыўся першы кінатэатр.

Дабравешчанская царква XI стагоддзя – гонар Віцебска. Гэты помнік архітэктуры перажыў усе войны і бедствы, але ў 1961 годзе быў узарваны. Пасля знішчэння яе руіны былі закансерваваны, а ў 1992 годзе будынак быў адбудаваны.

У цэнтры Віцебска знаходзіцца сімвал, важны для кожнага жыхара горада, – гэта ратуша (малюнак 1). Калі ў горадзе ёсць ратуша, значыць, ён незалежны. Пабудаваць ратушу на гарадской плошчы маглі толькі ў тых гарадах, якім было падаравана Магдэбурскае права. Першая віцебская ратуша была драўлянай, яе разбурылі, калі горад пазбавілі Магдэбурскага права. У 1775 годзе  на тым жа месцы была пабудавана новая ратуша, менавіта яна і дайшла да нашых дзён. Зараз у гэтым будынку размешчаны Віцебскі абласны краязнаўчы музей.



Малюнак 1 – Ратуша ў цэнтры Віцебска

Віцебск ганарыцца не толькі сваімі архітэктурнымі шэдэўрамі, але і сваімі людзьмі. Мастакі Марк Шагал, Казімір Малевіч, скульптары Заір Азгур і Андрэй Бембель жылі і тварылі тут. Жарэс Алфераў, вядомы навуковы дзеяч, лаўрэат Нобелеўскай прэміі, таксама нарадзіўся ў Віцебску.

Да выдатным мясцінам апошніх дзесяцігоддзяў можна смела аднесці Летні амфітэатр – канцэртную пляцоўку ў цэнтры горада. Першы канцэрт тут адбыўся ў 1988 годзе. Цяпер гэта галоўная сцэнічная пляцоўка «Славянскага базару ў Віцебску».

Зараз Віцебск – гэта горад, у якім незвычайна гарманічна спалучаюцца традыцыі мінулых эпох і модныя павевы дня сённяшняга. Кожны куток Віцебска прасякнуты духам гісторыі, дыхае жыццём, выпраменьваючы адчуванне цяпла. А ўсё таму, што гісторыя горада Віцебска багатая на падзеі. Сярод іх знайшлося месца як трагічным, так і радасным момантам. Усё гэта ў выніку падахвочвала горад да развіцця і ўдасканалення. Як вынік – сёння Віцебск ганарыцца сваімі ўнікальнымі архітэктурнымі ансамблямі, помнікамі і проста гісторыяй.



Малюнак 2 – Віцебскі амфітэатр

УДК 821.161.3

## ВАЙНА Ў ЖЫЦЦІ І ТВОРЧАСЦІ ІВАНА МЕЛЕЖА

*Студэнт – Маскалёнак А.С., 5 мот, 2 курс, ФТС*
*Навуковы кіраўнік – Фокіна І.С., ст. выкладчык*
*УА «Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт»,*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

**Анатацыя.** Артыкул прысвечаны тэме Вялікай Айчыннай вайны ў жыцці і творчасці Швана Мележа.

**Ключавыя словы:** беларуская літаратура, тэма Вялікай Айчыннай вайны, гераізм, гісторыя.

Шмат часу прайшло з моманту завяршэння Вялікай Айчыннай вайны, зыходзіць пакаленне, якое памятае жахі гэтай страшэннай трагедыі нашага народу. Але і сёння людзі памятаюць пра вайну. Яна прайшла праз кожную хату, кватэру, праз кожную сям'ю.

Вялікая Айчынная вайна ўвайшла ў нашу гісторыю як небывалая па жорсткасці, трагізму і гераізму барацьба народаў супраць гітлераўскага